УДК 821. 161. 3

А.В.Шарапава, Магілёў (Беларусь)

# ВЫВУЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ ПАЎЛА МІСЬКО Ў КАНТЭКСЦЕ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “СУСВЕТНАЯ І АЙЧЫННАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА”: ТЭАРЭТЫЧНА-ЖАНРАВЫ АСПЕКТ

В статье предлагаются методические рекомендации по проведению занятий по теме «Павел Мисько». Доказывается, что жанр – это единство содержания, художественной структуры и восприятия. Поэтому все задания и упражнения подчинены исследованию смысло- и формообразующих элементов текстов для детского чтения названного писателя. Подчеркивается новаторский характер произведений Мисько, а также творческое переосмысление им ведущих традиций детской литературы, освоение жанра литературной сказки, рассказа, повести.

The article offers guidelines for the training on "Pavel Misko". It is proved that the genre – a unity of content, structure and artistic perception. Therefore, all the assignments and exercises are subject to the investigation of semantic-formative elements and texts for children's reading called the writer. Emphasizes innovative works by Misko and the creative reinterpretation of them leading traditions of children's literature, the development of the literary fairy tale genre, short stories, stories.

Пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы па спецыяльнасці “Дашкольная адукацыя. Дадатковая спецыяльнасць” важнае месца займае вучэбная дысцыпліна “Сусветная і айчынная дзіцячая літаратура”. Выпускнік павінен ведаць спецыфічныя ўласцівасці дзіцячай кнігі, што базіруюцца на ўліку ўзроставай спецыфікі чытача, характэрныя прыкметы розных жанраў дзіцячай літаратуры, віды работ з канкрэтным літаратурным творам ва ўстановах дашкольнай адукацыі і іншае. Фарміраванню падобных кампетэнцый садзейнічаюць розныя метады працы студэнта і выкладчыка.

У такім кантэксце важным элементам педагагічнай сістэмы з’яўляецца вывучэнне літаратурнай спадчыны Паўла Місько. Тыпавой вучэбнай праграмай ТД-А.256/ тып. прапануецца разглядаць творчасць гэтага пісьменніка ў кантэксце тэмы “Дзіцячая літаратура 1955 − 1985 гадоў”. На вывучэнне названай тэмы адводзіцца пяць аўдыторных гадзін: дзве лекцыйныя і тры практычных [2, с. 7]. Мэтазгодна адвесці дзве практычныя гадзіны на вывучэнне творчасці Паўла Місько. Па-першае, цэлы шэраг яго твораў уваходзіць у залаты фонд беларускай дзіцячай літаратуры, яны цікавыя, займальныя, маюць значны выхаваўча-пазнавальны патэнцыял. Па-другое, манаграфічнае вывучэнне асобы аднаго пісьменніка дае магчымасць асэнсаваць найбольш паказальныя тэндэнцыі літаратуры ўсяго названага перыяду. Па-трэцяе, улічваючы спецыфіку творчасці пісьменніка, вывучэнне гэтай тэмы праводзіцца па жанравым прынцыпе. Зыходзячы з гэтага, студэнтам пастаянна згадваюцца такія паняцці, як “літаратурны род”, “эпас”, “літаратурны жанр”,

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета

"літаратурная казка", "апавяданне", "аповесць" і інш. Такім чынам, у межах заняткаў будуць рэалізаваны патрабаванні да фарміравання кампетэнцый студэнтаў, вызначаных тыпавой праграмай [2, с. 4-5].

Лепшаму асэнсаванню творчасці пісьменніка спрыяюць не толькі пытанні і заданні да практычных заняткаў, але і заданні для самастойнай работы. Такім чынам, усе пытанні і заданні па тэме могуць быць умоўна падзелены на два блокі: 1) для практычных заняткаў; 2) для самастойнай работы. У нашай практыцы выкладання дысцыпліны "Сусветная і айчынная дзіцячая літаратура" выпрацавана сістэма работы, што прадугледжвае пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў выкананне пэўнага комплексу заданняў, якія садзейнічаюць фарміраванню і развіццю належных кампетэнцый. Студэнты працуюць самастойна, звяртаюцца да літаратуразнаўчых крыніц з тым, каб пацвердзіць ці абвергнуць свае думкі і гіпотэзы.

На практычных занятках студэнтам прапануюцца наступныя пытанні для вывучэння і абмеркавання, а таксама практыкаванні.

1. Раскрыццё ўнутранага свету дзяцей і дарослых у аповесці "Навасёлы, або Праўдзівая, часам вясёлая, часам страшнаватая кніга пра незвычайны месяц у жыцці Жэні Мурашкі" (1972). Элементы прыгодніцтва ў творы. Педагагічная канцэпцыйнасць аповесці. Практыкаванне 1. Прачытайце мастацкі тэкст, прааналізуйце яго, зрабіце неабходныя запісы ў дзённік чытача. Практыкаванне 2. Размеркаваўшыся па міні-групах, напішыце псіхолага-педагагічныя характарыстыкі дзяцей, што адлюстраваны ў аповесці (Жэня Мурашка, Вася, Жора, Паўлуша, Сярожа, Жэня Гаркавы, Галка, Марынка і інш.). Практыкаванне 3. Раскажыце пра дарослых персанажаў аповесці. Вызначце, якi выхаваўчы патэнцыял маюць вобразы Лявона Іванавіча і Івана Іванавіча. Практыкаванне 4. Паспрабуйце на аснове аднаго з раздзелаў аповесці (па выбары студэнтаў) стварыць міні-п'есу: падрыхтаваць дыялогі, прадумаць касцюмы, дэкарацыі, музычнае афармленне і інш. Падумайце, якія выхаваўчыя магчымасці маюць эпізоды аповесці, што звязаны з дзейнасцю гуртка "Арляты".

2. Гуманістычны пафас аповесці "Прыгоды Бульбобаў" (1977). Арыгінальнасць падачы матэрыялу (свет вачамі сабачанят); анімалістычны псіхалагізм твора. Практыкаванне 1. Прачытайце мастацкі тэкст, прааналізуйце яго, зрабіце неабходныя запісы ў дзённік чытача. Вызначце праблемнае поле аповесці. Практыкаванне 2. Узгадайце вядомыя творы сусветнай і айчыннай літаратуры, дзе аповед вядзе прадстаўнік флоры ці фаўны. Вызначце, для чаго пісьменнікі выкарыстоўваюць падобны прыём. Практыкаванне 3. Падрыхтуйце міні-паведамленні пра розныя пароды сабак, пра гераічныя ўчынкі гэтых жывёл на карысць чалавека. Практыкаванне 4. Прачытайце аповесць "Як на нашы імяніны", што

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета

з'яўляецца своеасаблівым працягам папярэдняй. Зрабіце назіранні адносна эвалюцыі характараў Толі і Колі ў межах дзвюх аповесцяў.

3. Перапляценне навуковых звестак, рэальнага і фантастычнага ў аповесці "Эрпіды на планеце Зямля" (1987). Праблемы сяброўства, чалавечых узаемаадносін, фарміравання асобы ў творы. Практыкаванне 1. Прачытайце мастацкі тэкст, прааналізуйце яго, зрабіце неабходныя запісы ў дзённік чытача. Практыкаванне 2. На аснове тэксту аповесці падрыхтуйце фразеалагічны міні-слоўнік, у якім поруч з правільным лексічным значэннем было б і тлумачэнне ўстойлівага звароту, зробленае Эрпідам. Практыкаванне 3. У сшытках для самастойнай работы намалюйце Эрпіда, арыентуючыся на апісанне яго ў аповесці. Улічыце, што пісьменнік пры гэтым выкарыстоўвае назвы вядомых геаметрычных фігур. Зрабіце вывады адносна магчымасці выкарыстання тэксту аповесці на занятках па розных дысцыплінах. Практыкаванне 4. (высокага (прадуктыўнага творчага) узроўню). Прачытайце адзін з першых фантастычных твораў П. Місько для дзяцей аповесць "Грот афаліны" (1985). Вызначце, у чым актуальнасць гэтага твора ў нашы дні.

4 Асэнсаванне сучаснага жыцця ў казках П. Місько "Старамодны Заяц", "Сарока і Дзяцел" і інш. Практыкаванне 1. Прачытайце мастацкія тэксты, прааналізуйце іх, зрабіце неабходныя запісы ў дзённік чытача. Практыкаванне 2. Падрыхтуйце характарыстыкі анімалістычных вобразаў казак. Вызначце наватарства пісьменніка пры адлюстраванні вобразаў жывёл у параўнанні з традыцыйнымі народнымі казкамі падобнага тыпу.

5. Зборнік казак "Прыйдзі, дзень-залацень" (1993) як рымейк беларускіх народных казак. Практыкаванне 1. Прачытайце зборнік, прааналізуйце яго, зрабіце неабходныя запісы ў дзённік чытача. Практыкаванне 2. Выпішыце азначэнне паняцця "рымейк". Дакажыце, што пісьменнік выкарыстоўвае ў сваім зборніку менавіта гэты прыём. Для якога літаратурна-мастацкага кірунку ён найбольш характэрны і чаму? Практыкаванне 3. Многія тэксты зборніка абапіраюцца на вядомыя фальклорныя тэксты. Знайдзіце тыя казкі, якія па змесце блізкія да наступных фальклорных: "Як конь стаў старшым ад льва", "Коцік, пеўнік і лісіца" , "Дзедава рукавічына" , "Дзяцел, лісіца і варона" , "Як кот звяроў напалохаў" , "Былінка і верабей" , "Жораў і чапля" , "Каза-манюка", "Жаронцы", "Дзедка з бабкай і воўк", "Дзедава дачка і бабіна дачка". Згрупуйце тэксты па групах на аснове зместу, запоўніце табліцу па ўзоры.

| | **Фальклорны тэкст** | **Аўтарскі варыянт** |
|---|---|---|
| **Казкі пра жывёл** | "Курка-рабка" | "Сама рабка, на галаве – чырвона шапка" |
| **Чарадзейныя казкі** | "Кіліпка-сынок" | "Як ведзьма Ванятку улавіла", "У палоне ў ведзьмы" і "Гусі-лебедзі ляцелі…" |
| **Сацыяльна-бытавыя казкі** | "Кацярына" | "Пра залатую ступу і пана" |

Практыкаванне 4. Размеркаваўшыся па міні-групах, выпішыце з тэкстаў зборніка хуткамоўкі, загадкі, песні, прыказкі і прымаўкі. Перамагае тая міні-група, якая знайшла большую колькасць прыкладаў і правільна іх

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета

класіфікавала. Практыкаванне 5. Вызначце асаблівасці мовы зборніка, прывядзіце прыклады рытмізаванай прозы. Практыкаванне 6. Ахарактарызуйце кампазіцыйныя асаблівасці казак. Вызначце ролю традыцыйных элементаў жанру − зачыну і канцоўкі.

Самастойная работа студэнтаў выконваецца па наступным алгарытме: выкананне практыкаванняў, пісьмовае іх афармленне ў сшытку для самастойнай работы, праверка выкладчыкам гэтых практыкаванняў (франтальная або выбарачная). Неабходна адзначыць, што змест самастойнай работы вядомы студэнтам ужо з самых першых этапаў вывучэння дысцыпліны. Па тэме "Павел Місько" прапануюцца наступныя практыкаванні.

1. *Звесткі з біяграфіі Паўла Місько (1931 − 2011).* Неабходна зрабіць тэзісны канспект старонак артыкула з вучэбнага дапаможніка Беларуская дзіцячая літаратура [1, с. 519-543], што прысвечаны біяграфіі творцы. На практычных гэтыя тэзісы могуць пашырацца і ўдакладняцца словамі выкладчыка і студэнтаў.

2. *Пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял апавяданняў Паўла Місько пра прыроду ("Лясныя дарункі", "Восеньскім днём", цыкл "Ласіныя пацеркі" з кнігі "Прыгоды Бульбобаў" і інш.).* Студэнтам прапануецца ахарактарызаваць спецыфіку паэтызацыі прыроды роднага краю, ідэю непарыўнай сувязі чалавека і прыроды, што рэалізуецца ў названых апавяданнях пісьменніка.

3. *Апавяданні Паўла Місько "Добры чалавек", "Каляндар сумлення", "Як дзеда дзялілі", "Смажаны лёд, або апавяданне пра Несусветнага Хлуса", "Чараўнік Косця", "Як Саша ў космас лятаў" і інш.* Студэнтам неабходна прачытаць творы, вызначыць іх праблемнае поле. Разам з тым, яны павінны вызначыць, якія асаблівасці характару дзіцяці паказаны ў тым ці іншым апавяданні. Неабходна ахарактарызаваць сродкі мастацкай выразнасці, выкарыстаныя пісьменнікам, вызначыць мастацка-эстэтычную ролю гумару і іроніі ў тэкстах.

Для праверкі ведаў студэнтаў па творчасці П. Місько мэтазгодна выкарыстаць комплекс тэставых заданняў, у якіх на адно пытанне даецца чатыры варыянты адказаў, і неабходна выбраць адзін − правільны − адказ.

| | |
|---|---|
| 1. Вызначце гады жыцця Паўла Місько<br>- 1912 – 1995 - 1920 – 1981<br>- 1917 − 2006 + 1931 − 2011 | 11. Як звалі мядзведзя з аповесці П. Місько "Эрпіды на планеце Зямля"?<br>+ Мумрык - Вінні<br>- Мішка - Умка |
| 2. Пасля заканчэння БДУ П. Місько працаваў<br>- настаўнікам + журналістам<br>- пісьменнікам - сакратаром СП БССР | 12. Эрпіды з аповесці П. Місько − гэта<br>- чараўнікі + паліглоты<br>- жывёлы - артысты |
| 3. Якімі садавінамі пачаставала бабуля Вера героя апавядання П. Місько "Добры чалавек"?<br>- яблыкамі і грушамі + яблыкамі і слівамі<br>- слівамі і вішнямі - вішнямі і грушамі | 13. Што шукаў у лесе дзед Вані Гардзея з аповесці П. Місько "Эрпіды на планеце Зямля"?<br>+ магілу сяброў-партызан - клад<br>- грыбы - ягады |
| 4. Якіх птушак аддаў Косця Чыжык у школьны жывы куток(апавяданне "Чараўнік Косця")?<br>- сініц - вераб'ёў | 14. Кім быў па прафесіі Лявон Іванавіч з аповесці П. Місько "Навасёлы"?<br>- артыстам цырка - артыстам драматычнага |

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета

| | |
|---|---|
| - гракоў + папугаеў | тэатра<br>+ артыстам лялечнага тэатра - артыстам музычнага тэатра |
| 5. Якое даручэнне атрымалі Сцёпа і Толя ад настаўніцы (апавяданне "Каляндар сумлення")?<br>- намаляваць насценгазету + намаляваць каляндар надвор'я<br>- зрабіць паштоўку - падрыхтавацца да выразнага чытання верша | 15. Каго іграў Жэня Мурашка з аповесці П. Місько "Навасёлы" ў пастаноўцы лялечнага тэатра?<br>- Эрпіда-1 - Эрпіда-2<br>- Мядзведзя + Сабаку |
| 6. Якая жывёла не прыходзіла да Зайца-краўца(казка "Старамодны Заяц")?<br>- Мядзведзь + Воўк<br>- Гарнастай - Ліса | 16. Што знайшлі дзеці з аповесці П. Місько "Навасёлы", калі купаліся на рэчцы?<br>- кулямёт - пісталет<br>+ авіябомбу - корцік |
| 7. На якім музычным інструменце іграла Сарока (казка "Сарока і Дзяцел")?<br>- скрыпка - барабан<br>+ трашчотка - гітара | 17. Якую хатнюю жывёлу набыў сабе жэня Мурашка з аповесці П. Місько "Навасёлы"?<br>- сабаку + ката<br>- хамяка - рыбку |
| 8. Як звалі бацьку сабачанят Булькі і Боба (аповесць "Прыгоды Бульбобаў")?<br>- Барбос + Султан<br>- Рэкс - Капітан | 18. Зборнік казак П. Місько "Прыйдзі, дзень-залацень" − гэта<br>- алюзія на беларускія казкі - пародыя на беларускія казкі<br>+ рымейк беларускіх казак - плагіят |
| 9. Якая слабасць была ў бабулі Колі і Толі (аповесць "Як на нашы імяніны")?<br>- вязанне - тэлевізар<br>- фіялкі + кактусы | 19. Скразны персанаж зборніка казак П. Місько "Прыйдзі, дзень-залацень" − хлопчык<br>- Мішутка + Ванятка<br>- Алёшка - Міколка |
| 10. Колькі Эрпідаў прыляцела на Зямлю (аповесць "Эрпіды на планеце Зямля")?<br>- 1 - 2<br>+ 3 - 4 | 20. У аповесці П. Місько "Грот афаліны" афаліна гэта<br>- ад птушкі - ад расліны<br>- ад дрэва + ад дэльфіна |

Такім чынам, прапанаваная сістэма вывучэння творчасці Паўла Місько з улікам тэарэтычных аспектаў і жанравай спецыфікі спрыяе фарміраванню ў будучага педагога належных кампетэнцый, садзейнічае найбольш поўнаму выяўленню здольнасцяў студэнтаў, а таксама своечасоваму правядзенню папераджальных і карэктуючых дзеянняў, уцягвае ў працэс пазнання ўсіх навучэнцаў. Разам з тым, студэнты атрымліваюць належныя веды тэарэтычнага характару, асэнсоўваюць жанравую разнастайнасць айчыннай літаратуры, вобразна-выяўленчае багацце беларускай мовы. Выкарыстаныя пры вывучэнні творчасці Паўла Місько метады і прыёмы, заданні, тэсты могуць стаць метадычным падмуркам будучай прафесійнай дзейнасці сённяшніх студэнтаў.

Літаратура:

1. Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапам. / А.М.Макарэвіч [і інш.]; пад агул. рэд. А.М.Макарэвіча, М.Б.Яфімавай. – Мінск : Выш. шк., 2008. – С. 519-543.
2. Мировая и отечественная детская литература : типовая учебная программа для высших учебных заведений по специальностям : 1 - 01 01 01 Дошкольное образование; 1 - 01 01 02 Дошкольное образование. Дополнительная специальность / сост. И.Г. Добрицкая, О.Б. Нестерович. – Минск, 2009. – 35 с.

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета